Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____________ С. Л. Шпарло
«07» 07 2023 г.
Рэгістрацыйны № 7-08-1/эуч.

# ПРАГРАМА
# НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ ПРАКТЫКІ

*для спецыяльнасці паглыбленай вышэйшай адукацыі*
*7-06-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць*

2023

Праграма практыкі складзена на аснове адукацыйнага стандарта паглыбленай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 7-06-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць, зацверджанага Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 29.06.2023 № 182


**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*Ю. М. Галкоўская,* дэкан факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*Н. Ю. Вайцэховіч,* загадчык кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*Ж. Л. Раманава,* загадчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт


**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 11 ад 26.06.2023 г.)

*саветам* факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 10 ад 29.06.2023 г.)

**УЗГОДНЕНА**

Намеснік дырэктара па навуковай рабоце
дзяржаўнай установы "Цэнтральная навуковая
бібліятэка імя Якуба Коласа
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі"
____________________М. П. Ахрэмчык

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма практыкі распрацавана ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі; адукацыйным стандартам паглыбленай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 7-06-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць, зацверджаным Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 29.06.2023 № 182; вучэбнымі планамі ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 7-06-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (Прафілізацыя: Тэорыя і методыка навукова-даследчай і аналітычнай дзейнасці).

Адукацыйная праграма паглыбленай вышэйшай адукацыі накіравана на фармірміраванне універсальных, спецыялізаванных і паглыбленых прафесійных кампетэнцый, якія дазваляюць рашаць іавацыйныя задачы прафесійнай дзейнасці, прымяняць паглыбленыя навукова-тэарэтычныя, метадалагічныя веды і даследчыя ўменні, а таксама сацыяльна-асабовыя якасці, якія адпавядаюць запытам дзяржавы і грамадства.

Вытворчая практыка накіравана на замацаванне магістрантамі ведаў і ўменняў, якія былі атрыманы ў працэсе тэарэтычнага навучання пры засваенні адукацыйнай праграмы магістратуры, набыццё навыкаў даследавання актуальных навуковых і прыкладных праблем, рашэння сацыяльна-прафесійных задач, прымянення інавацыйных тэхналогій і інш.

Па спецыяльнасці 7-06-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць вучэбнымі планамі ўстановы вышэйшай адукацыі, зацверджанымі рэктарам універсітэта, прадугледжаны наступны від практыкі – навукова-даследчая практыка.

*Мэта навукова-даследчай практыкі* – замацаванне ведаў і ўменняў, атрыманых у працэсе тэарэтычнага навучання ў магістратуры, авалоданне навыкамі даследавання актуальных навуковых праблем бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, уменнямі выкладчыцкай работы ва ўстанове вышэйшай адукацыі і распрацоўкі вучэбна-метадычнай дакументацыі, апрабацыі вынікаў навуковых даследаванняў.

*Асноўнымі задачамі* праходжання навукова-даследчай практыкі магістрантамі з’яўляюцца:

– фарміраванне ўменняў ажыццяўляць навукова-даследчую дзейнасць у бібліятэчна-інфармацыйнай сферы, прымяняць асноўныя метадалагічныя падыходы, сістэму навуковых метадаў, сучасныя канцэпцыі, якія выкарыстоўваюцца ў бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве пры рашэнні навуковых і практычных задач;

– фарміраванне цэласнага ўяўлення аб змесце адукацыйнага працэсу і асаблівасцях укараненны вынікаў навуковых даследаванняў у педагагічную практыку;

– набыццё ўменняў распрацоўкі вучэбна-метадычных матэрыялаў па выніках навукова-даследчай дзейнасці;

– удасканаленне аналітычнай і рэфлексіўнай дзейнасці;

– фарміраванне адэкватнай самаацэнкі, адказнасці за вынікі сваёй навукова-даследчай працы;

– падрыхтоўка матэрыялаў да магістарскай дысертацыі, правядзенне педагагічнага эксперыменту ў адпаведнасці з абранай тэмай.

Для дзённай і завочнай формы навучання вучэбнымі планамі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" прадугледжваецца праходжанне навукова-даследчай практыкі на працягу 2-х тыдняў у другім семестры (3 заліковыя адзінкі). Форма кантролю – дыферынцыраваны залік.

У выніку праходжання навукова-даследчай практыкі магістрант павінен авалодаць шэрагам універсальных, паглыбленых прафесійных кампетэнцый, спецыялізаванных кампетэнцый. У тым ліку:

УК-1. Прымяняць метады навуковага пазнання ў даследчай дзейнасці, генерыраваць і рэалізоўваць інавацыйныя ідэі.

УПК-1. Ажыццяўляць навукова-даследчую дзейнасць ў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы, прымяняць асноўныя метадалагічныя падыходы, сістэму навуковых метадаў, сучасныя канцэпцыі, якія выкарыстоўваюцца ў бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве пры рашэнні навуковых і практычных задач.

СК-3. Прымяняць крыніцазнаўчую базу бібліятэказнаўчых даследаванняў, навыкі пошуку, апрацоўваць і аналізаваць даныя, якія прадстаўлены ў навуковых крыніцах, выкарыстоўваць іх у навуковай і адукацыйнай практыцы.

СК-4. Прымяняць методыкі і педагагічныя тэхналогіі выкладання бібліятэчна-інфармацыйных дысцыплін, мадэліраваць іх змест.

СК-5. Прымяняць метадалогію педагагічных даследаванняў, методыку правядзення педагагічнага эксперымента, які рэалізуецца у галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства.

Перад пачаткам практыкі праводзіцца ўстановачны інструктаж па правілах праходжання практыкі, па ахове працы і тэхніцы бяспекі. На ім магістранты інфармуюцца аб тэрмінах і месцах праходжання практыкі, а таксама атрымліваюць праграму практыкі.

У якасці баз для правядзення навукова-даследчай практыкі могуць выступаць профільныя кафедры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", іншых устаноў вышэйшай адукацыі, супрацоўнікі якіх з'яўляюцца навуковымі кіраўнікамі магістарскіх дысертацый па спецыяльнасці "Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць", вядучыя бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, якія маюць статус навуковых устаноў.

У перыяд практыкі на магістрантаў распаўсюджваюцца заканадаўства аб ахове працы і правілы ўнутранага працоўнага распарадку ўстановы – базы практыкі. У выпадку іх парушэння, а таксама

патрабаванняў тэхнікі бяспекі магістрант можа быць адхілены ад праходжання практыкі з наступнай неатэстацыяй па практыцы.

Магістрант, які не выканаў праграму практыкі, атрымаў адмоўны водгук кіраўніка практыкі ад кафедры або атрымаў нездавальняючую адзнаку пры здачы заліку, ці быў хворы падчас практыкі, праходзіць яе паўторна ў вольны ад навучання час. Невыкананне праграмы практыкі без уважлівых прычын з'яўляецца падставай для адлічэння магістранта з магістратуры.

Вынікі практыкі, найбольш значныя прапановы і меркаванні выносяцца і абмяркоўваюцца на навуковых канферэнцыях, пасяджэннях кафедры і пры станоўчай ацэнцы могуць быць рэкамендаваны да друку.

## ЗМЕСТ ПРАКТЫКІ

Навукова-даследчая практыка магістрантаў складаецца з трох відаў дзейнасці: навукова-даследчай, аналітычнай, вучэбна-метадычнай.

*Навукова-даследчая дзейнасць* прадугледжвае:

– праца з эмпірычнай базай даследавання ў адпаведнасці з абранай тэмай магістарскай дысертацыі (складанне праграмы і плана эмпірычнага даследавання, пастаноўка і фармулёўка задач эмпірычнага даследавання, вызначэнне аб'екта эмпірычнага даследаванні, выбар методыкі эмпірычнага даследавання, вывучэнне метадаў збору і аналізу эмпірычных даных);

– правядзенне сацыялагічнага і/ці статыстычнага даследавання ў межах тэмы магістарскай дысертацыі;

– засваенне методык анкетавання і інтэрв'юіравання (складанне анкеты, апытанне, аналіз і абагульненне вынікаў);

– засваенне методык назірання, эксперыменту і мадэлявання;

– апрабіраванне матэрыялаў даследавання і інш.

*Аналітычная дзейнасць* прадугледжвае:

– вывучэнне навукова-даследчай дзейнасці кафедры, вынікаў навуковых даследаванняў;

– падрыхтоўка аналітычнага агляда навуковай літаратуры па тэме, вызначанай кіраўнікам практыкі;

– падрыхтоўка артыкула (даклада) па тэме магістарскай дысертацыі, узгодненай з кіраўніком практыкі і адпаведнай кірунку навуковых даследаванняў магістранта;

– падрыхтоўка «кейсаў», матэрыялаў для практычных работ па выніках выканання навукова-даследчай дзейнасці ў межах тэмы магістарскай дысертацыі;

– іншыя формы работ, вызначаныя навуковым кіраўніком.

*Вучэбна-метадычная работа:*

– вывучэнне структуры адукацыйнага працэсу на факультэце ўстановы вышэйшай адукацыі і пазнаёміцца з правіламі вядзення выкладчыкамі справаздачнай дакументацыі;

– вывучэнне дакументаў нарматыўнага забеспячэння адукацыйнай дзейнасці ўніверсітэта. У працэсе работы з нарматыўнымі дакументамі магістрант павінен вывучыць структуру і змест профільных адукацыйных стандартаў і вылучыць патрабаванні да прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў; прааналізаваць вучэбны план падрыхтоўкі спецыяліста і вучэбныя праграмы па вучэбных дысцыплінах кафедоы;

– азнаямленне з методыкамі падрыхтоўкі і правядзення розных форм вучэбных заняткаў – лекцыйных, практычных заняткаў, семінараў, кансультацый, залікаў, экзаменаў, курсавога і дыпломнага праектавання.

Вынікам гэтага этапу з’яўляюцца канспекты, схемы, прэзентацыі і іншыя дыдактычныя матэрыялы.

Магістрант можа праводзіць практычныя вучэбныя заняткі, але толькі сумесна з выкладчыкам (як стажор). Прысутнасць кіраўніка практыкі ў аўдыторыі пры правядзенні магістрантам вучэбных заняткаў з’яўляецца абавязковай.

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Патрабаванні да парадку праходжання практыкі, зместу і афармлення справаздачы

Падчас праходжання практыкі магістрант пад кантролем кіраўніка практыкі ад кафедры выконвае праграму практыкі і індывідуальнае заданне.

Кіраўнік навукова-даследчай практыкі магістранта:

– знаёміць магістранта са спецыфікай навукова-даследчай дзейнасці ва ўмовах універсітэта, высновамі навукова-педагагічнай дзейнасці;

– аказвае метадычную дапамогу магістрантам пры распрацоўцы праграмы педагагічнага даследавання і/ці праграмы апрабацыі матэрыялаў магістарскай дысертацыі;

– кансультуе магістрантаў па пытаннях распрацоўкі вучэбна-праграмнай дакументацыі ва ўстановах вышэйшай адукацыі, укаранення вынікаў даследванняў у адукацыйны працэс, па пытаннях выканання індывідуальных заданняў, вызначаных праграмай практыкі;

– правярае і ацэньвае справаздачную дакументацыю магістрантаў;

– ажыццяўляе выніковы кантроль практыкі ў форме дыферынцыраванага заліку;

– уносіць прапановы па ўдасканаленні практыкі;

– удзельнічае ў рабоце савета факультэта і пасяджэннях кафедраў пры абмеркаванні пытанняў па падрыхтоўцы, правядзенні і падвядзенні вынікаў практыкі.

Магістрант-практыкант абавязаны:

– пазнаёміцца да пачатку практыкі з яе праграмай;

– своечасова і якасна выконваць палажэнні праграмы практыкі і прадугледжаныя індывідуальныя заданні;

– выконваць заданні кіраўнікоў практыкі ад кафедры;

– працаваць у час практыкі з улікам распарадку рабочага дня базы практыкі, установы адукацыі (раскладу вучэбных заняткаў на факультэтах);

– строга выконваць правілы ўнутранага працоўнага распарадку, правілы аховы працы, тэхнікі бяспекі і вытворчай санітарыі па месцы праходжання практыкі;

– прымаць асабісты ўдзел у навукова-даследчай рабоце па заданні кафедры;

– штодзённа весці дзённік практыкі;

– па сканчэнні практыкі здаць кіраўніку практыкі ад кафедры індывідуальную справаздачу і завераны дзённік.

Па заканчэнні практыкі адбываецца абарона практыкі, на якую неабходна прадставіць комплекс справаздачных дакументаў:

– дзённік навукова-даследчай практыкі;

– пісьмовую індывідуальную справаздачу аб выніках праходжання навукова-даследчай практыкі;

– дадаткі (пры неабходнасці);

– характарыстыку (водгук) па выніках праходжання навукова-даследчай практыкі яго кіраўніка.

Ход выканання праграмы практыкі, а таксама вынікі праведзенай работы заносяцца ў *дзённік навукова-даследчай практыкі,* які з'яўляецца сродкам кантролю за ходам яе выканання. Дзённік павінен запаўняцца штодзённа. У ім змяшчаюцца звесткі аб змесце і выніках работы за дзень, аб сабраным, сістэматызаваным і прааналізаваным фактычным матэрыяле, вынікі выканання індывідуальнага задання, асабовыя ўражанні і меркаванні.

Дзённік практыкі павінен адлюстроўваць звесткі аб паслядоўнасці выканання праграмы практыкі і індывідуальных заданняў, аб змесце штодзённай даследчай і вучэбна-метадычнай работы. Дзённік абавязкова візіруецца кіраўніком практыкі ад кафедры.

*Пісьмовая індывідуальная справаздача* аб выніках праходжання навукова-даследчай практыкі павінна адпавядаць праграме навукова-даследчай практыкі і ўтрымліваць кароткае апісанне дзейнасці базы практыкі, апісанне праведзенай магістрантам працы, вывады і прапановы аб ходзе праходжання практыкі. У справаздачы па практыцы павінны быць адлюстраваны ўсе віды работ, выкананыя ў адпаведнасці з праграмай і індывідуальным заданнем навукова-даследчай практыкі. У якасці дадаткаў да справаздачы могуць быць прадастаўлены фактычныя і аналітычныя матэрыялы, у т. л. спіс бібліяграфіі па тэме магістарскай дысертацыі, тэкст падрыхтаванага артыкула (даклада) па тэме магістарскай дысертацыі і інш.

Справаздача аб праходжанні практыкі павінна быць аформлена на стандартных аркушах фармату А4 (210x297 мм) з аднаго боку. Аб'ём справаздачы 15–20 старонак Тэкст друкуецца праз інтэрвал 1,5 шрыфтам Times New Roman 13/14 пунктаў. Размеры палёў: злева – 30 мм, справа – 15 мм, уверсе – 20 мм, знізу – 20 мм. Абзацны водступ – 1,25 мм. Тэкст абавязкова выраўніваецца па шырыне. Нумарацыя старонак справаздачы павінна быць бесперапыннай. Табліцы, якія даюцца ў справаздачы, нумаруюцца паслядоўна. Дадаткі таксама нумаруюцца. На ўсе дадаткі ў асноўным тэксце справаздачы абавязкова прыводзяцца спасылкі.

Справаздача падпісваецца магістрантам-практыкантам.

Справаздача, якая складаецца на аснове канкрэтнага фактычнага матэрыялу і суправаджаецца крытычным аналізам, утрымлівае:

– тытульны ліст (дадатак 1);

– змест, у якім павінны быць пералічаны ўсе раздзелы справаздачы і ўказаны нумары старонак;

– уводзіны;

– асноўную частку справаздачы па раздзелах: "Навукова-даследчая дзейнасць", "Аналітычная дзейнасць", "Вучэбна-метадычная работа".

– заключэнне;

– дадаткі (пры неабходнасці).

Ва ўводзінах указваюцца мэта, месца, дата пачатку і працягласць практыкі; пералік выкананых у працэсе практыкі работ і заданняў.

Асноўная частка змяшчае апісанне паслядоўнасці праходжання навукова-даследчай практыкі, характарыстыку базу практык, кароткае апісанне выкананых работ і тэрміны іх ажыццяўлення, апісанне праведзеных навуковых даследаванняў, з указаннем напрамкаў, відаў, метадаў і спосабаў іх ажыццяўлення, характарыстыку вынікаў рэалізаванага ў межах практыкі даследавання (у выглядзе тэксту, табліц, графікаў, схем і інш.). Апісваюцца віды работ, якія былі выкананы у межах кожнага з раздзелаў: "Навукова-даследчая дзейнасць", "Аналітычная дзейнасць", "Вучэбна-метадычная работа".

Заключэнне ўключае ацэнку паўнаты рашэння пастаўленых задач, ацэнку ўзроўню праведзеных навукова-практычных даследаванняў, рэкамендацыі па пераадоленні праблем, якія ўзніклі падчас праходжання практыкі і правядзення навуковага даследавання ці яго часткі, ацэнку магчымасці выкарыстання атрыманых вынікаў у навукова-даследчай рабоце магістранта і выпускной рабоце магістра.

У канцы праходжання навукова-даследчай практыкі магістрант даводзіць да ведама кіраўніка практыкі ад кафедры асноўныя палажэнні і вывады, зробленыя ім па выніках праходжання практыкі. Кіраўнік практыкі ад кафедры дае пісьмовую характэрыстыку (водгук) аб рабоце магістранта ў перыяд практыкі.

Справаздачныя дакументы па практыцы прадстаўляюцца для кантролю не пазней за пяць дзён пасля заканчэння практыкі

(уключаючы выхадныя і святочныя дні) кіраўніку навукова-даследчай практыкі і пасля абароны здаюцца на кафедру. Усе дакументы павінны быць надрукаваныя і прадстаўлены ў асобнай папцы з тытульным лістом.

Пісьмовая індывідуальная справаздача аб праходжанні практыкі і дзённік, аформленыя з парушэннем патрабаванняў праграмы, не прымаюцца, і, як вынік, магістрант не дапускаецца да абароны практыкі і не атэстоўваецца.

Ацэнка па практыцы выстаўляецца кіраўніком практыкі ад кафедры і ўлічвае якасць прадстаўленых магістрантам справаздачных матэрыялаў.

Ацэнка па навукова-даследчай практыцы заносіцца ў экзаменацыйную ведамасць і заліковую кніжку, прыраўноўваецца да ацэнак (заліку) па тэарэтычным навучанні і ўлічваецца пры падвядзенні вынікаў агульнай паспяховасці магістрантаў і прызначэнні ім стыпендыі.

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Педагогическое* исследование: методология, структура, содержание : пособие / А. И. Андарало, В. А. Листратенко, В. В. Чечет. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск : БГПУ, 2015. – 92 с.

2. *Титов, Е. В.* Готовность студентов к исследовательской деятельности в профессиональной сфере [Электронный ресурс]: монография / Е. В. Титов. – Москва : Научный консультант, 2022. – 72 с. – Режим доступа: https://znanium.ru/catalog/product/2136945.

*Дадатковая*

1. *Отчет* о научно-исследовательской работе. Структура и правила оформления = Справаздача аб навукова-даследчай рабоце. Структура і правілы афармлення : ГОСТ 7.32-2017. – Взамен ГОСТ 7.32-2001 ; введ. РБ 01.07.2019. – Минск : Белорус. гос. ин-т стандартизации и сертификации, 2019. – 27 с. – (Система стандартов по информации, библиотечному и издательскому делу).

*Дадатак 1*

**Тытульны ліст справаздачы па навукова-даследчай практыцы**

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый

**СПРАВАЗДАЧА**

па навукова-даследчай практыцы
_______________________________________________

Спецыяльнасць
7-06-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць

Магістрант

| | | |
|---|---|---|
| ________________ | ____________ | _________________ |
| (форма атрымання адукацыі) | (подпіс) | (прозвішча, імя, імя па бацьку) |

Кіраўнік практыкі

| | | |
|---|---|---|
| __________________ | _______________ | ___________________ |
| (займаемая пасада) | подпіс) | (прозвішча, імя, імя па бацьку) |

20__